Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 8 (601). Wilnia, Niadziela 17 Lutaha 1935 h. Hod XI (XIX).

MOKSLŲ AKADEMIJOS BIBLIOTEKA

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Каўказ і яго незалежніцкія імкненьні

Многа мы ўжо пісалі аб розных народах і краінах, што ськідаюць ярмо сваей няволі і імкнуцца на волю. Сяньня хоць збольшага пазнаёмімся з Каўказам і з яго палітычна-незалежніцкімі імкненьнямі.

Каўказ — гэта Край між Чорным і Касьпійскім морам на граніцы Эўропы і Азіі. Край гэты Каўкаскімі гарамі дзеліцца на дзьве часьці: на Прадкаўказьзе і Закаўказьзе.

Увесь Каўказ займае 469,220 кв. клм. прастору і налічае (паводле статыстыкі з 1910 г.) 12 міліонаў насельніцтва.

На поўначы Каўказу насельніцтва займаецца пераважна земляробствам і жывёлаводзтвам, а на паўдні садавоцтвам, вінным промыслам і ядвабніцтвам. Галоўным багацьцем краю зьяўляюцца вялікія капальні нафты (газы), а так-жа мангану, медзі, жалеза, солі, волава, серабра і інш. Галоўным горадам Каўказу — Тыфліс, а галоўным портам — Батум.

Насельніцтва Каўказу розна-нацыянальнае і рознапляменнае. Некаторыя плямёны, што жывуць у Каўкаскіх горах да сяньняшняга дня, яшчэ навукова недасьледжаны. Усіх каўкаскіх плямён і народаў навука налічае тры-чатыры дзесяткі.

Заселены такім мноствам народаў, розных між сабой паходжаньнем, мовай, верай, культурай і гістарычнымі традыцыямі, Каўказ на працягу вякоў тварыў цэлы рад большых і меншых дзяржаў. У канцы XVIII в., перамогшы і аслабіўшы Турцыю над Чорным морам, Расея пачала заваёўваць і Каўказ. Найдалей у глыб Каўказу пасунулася Расея за Александра I. Аканчальнае заваяваньне Каўказу Расеяй наступіла ў 1859 годзе.

Пасьля расейскай рэвалюцыі ў 1917 г. на Каўказе паўсталі незалежныя народныя рэспублікі: армянская, азэрбэйджанская (татарская), грузінская і дэрбэнская. Бальшавікі аднак доўга жыць гэтым рэспублікам не далі. Цяпер край прадкаўкаскі становіць бальшавіцкую адміністрацыйную адзінку пад назовам Паўночны Каўказ і Дон, а закаўкаскія рэспублікі і армянская, азэрбэйджанская і грузінская злучаны сяньня ў Закаўкаскую Фэдэрацыю Савецкіх Рэспублікаў. Ведама, гэтыя рэспублікі, так як і Сав. Беларусь, зьяўляюцца звычайнымі правінцыямі Масквы.

Аднак задушыць жывы народ нялёгка. Вось 14.VII мінулага году ў Брукселі прадстаўнікі Азэрбэйджану, Грузіі і Паўночнага Каўказу падпісалі Пакт Каўкаскай Конфэдэрацыі. Дакумант гэты пацьвярджае канечнасьць злучэньня сіл усіх каўкаскіх народаў у вызвольнай барацьбе, прадбача зарганізаваньне незалежнай і сконфэдэраванай каўкаскай дзяржавы і азначае падставы, на якіх гэтая дзяржава мае быць збудавана. Пакт гэты ў Конфэдэрацыі Каўкаскіх незалежных рэспублік прадбача так-жа і Армэнію.

Праўда, пакт падпісалі эмігранты, якія ўцякаючы ад бальшавіцкага прасьледу, апынуліся на чужыне. Але трэба ведаць, што гэта павадыры народу, які іх слухае і за імі ідзе. Ленін, як ведаем, рабіў рэвалюцыю ў Расеі пераважна так-жа седзячы заграніцай. А прышоў час і Ленін апынуўся на чале Расеі. Прыдзе так-жа час і павадыры Каўкаскай незалежнасьці зьявяцца на сваей бацькаўшчыне і势 станучь на яе чале.

Падпісаньне гэнага пакту на чужыне сапраўды ні ў чым не зьмяншае яго значэньня. Каўкаская эміграцыя не пакінула свайго Краю, з прычыны якога ўнутранага ў ім перавароту, эміграцыя гэна — гэта вынік маскоўскага гвалту, дакананага на волі каўкаскіх народаў. На чале каўкаскай эміграцыі знаходзяцца людзі, абдараваныя поўным даверам з боку свайго народу. Каўкаскія эмігранскія арганізацыі, што падпісалі пакт, гэта фактычна ўрады каўкаскіх народаў. Газэты пішуць, што Пакт Каўкаскай Конфэдэрацыі зьяўляецца верным адбіцьцём сяньняшніх настрояў каўкаскіх масаў, якія ў горах, далінах і нягорах Каўказу часта аружна змагаюцца з бальшавікамі за сваю вольнасьць. Ідэал незалежнасьці Каўказу аб'яднаў у вадно цэлае ўсе народы Каўказу, бяз розьніцы веры і нацыі.

Палітычна - вызвольны рух народаў Каўказу мае вялікае значэньне і для такога-ж вызваленьня беларускага народу. Вольны і незалежны Каўказ няўхільна вядзе за сабой вольную і незалежную Украіну і такую-ж урэшце Беларусь.

Спрыяем мы вызваленьню з няволі кожнага народу, дык тым больш спрыяем мы незалежніцка-вызвольнай працы народаў Каўказу, з вызваленьнем якіх у некаторым значэньні лучыцца і наша вызваленьне.

Развал маскоўскага бальшавізму

Стары год прайшоў у краіне тэрору і рызыкоўных спробаў пад знакам задавальняючых здабыткаў звонку і крывавых падзеяў у нутры.

Да паважнейшых сваіх здабыткаў у палітычнай галіне Масква адносіць дагаворы з Францыяй, Польшчаю і, разумеецца, і свой увахад у Лігу Народаў.

У нутранай палітыцы ў саветах, прызнаць мусім, валадаром СССР не ўдалося ўпарадкаваць і давесьці да трывалкасьці сваё панаваньне. СССР ад пачатку свайго існаваньня жывець у беспрарыўнае трывозе. Як чорная сотня пры цары нацкоўвала цёмныя масы на „жидов и инородцев“, абвінавачваючы іх у ваўсіх бедах і слабасьцях царскае Расеі, так і маскоўскія бальшавікі нацкоўваюць „рэвалюцыйны авангард“ на „контр-рэвалюцыю“, якую бачаць у ваўсім і ўсюды. Гэта старая мэтода маскоўшчыны, да якой ахвоча прыбягаюць і бальшавікі.

Калі раструбленая на ўвесь сьвет „пяцілетка“ не дала бальшавіком пажаданых вынікаў, абвінавачвалі інжынераў у „сабатажы“. Калі гарады пачынаюць корчыцца ад недастатку прадуктаў — абвінавачваюць „кулакоў“ і наагул вёску. Шукаюць „вінаватых“ і іх, разумеецца, находзяць, а нашоўшы — жорстка з імі расправаўляюцца.

Доўгі час бальшавікі трубілі аб пануючай гармоніі і консолідацыі ў сваей партыі, аж пакуль „жидовик“ Троцкі,—як называў яго Ленін,—не пачаў разварьваць бальшавіцкую крэпасьць, да будовы каторай і сам прылажыў шмат працы. Выкідаючы Троцкага з партыі і граніцаў СССР, прыдушыўшы апазыцыю, гэныя бальшавіцкія валадары былі пэўнымі, што яна больш не пасьмее падняць галавы. Аднак забойства Кірова пераканала іх у ўзросьце сілы апазыцыі і нутраной небясьпецы. А выкрытыя процімаскоўскія арганізацыі на Украіне і Беларусі не на жарт перапалохалі валадароў Масквы.

Старэйшыя з нас помняць, як царскія апрычнікі Трепов і Курлов бязьлітасна душылі малейшыя праявы вызвольнай думкі. Аднак гэная думка давяла да развалу царскую Расею і перамагла тыранаў. Сёньня ў СССР таксама бальшавікі бязьлітасна расправаўляюцца з вызвольнай думкай і незалежніцкімі імкненьнямі паняволеных народаў. Будзьма аднак пэўнымі, што на палёх, зрошаных крывёю верных сыноў Беларусі, Украіны і другіх паняволеных краінаў, чырвоныя ўладары знайдуць сабе згубу.

Антон Паддубіч.

Z dziejnaści Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury.

w. Šalciny. Brasłaŭskaha paw. Hadawaja sprawazdača z dziejnaści Hurtka B. I. H. i K. u Šalcinach za 1934 h. wyhladaje hetak: Šalcinaŭski Hurtok u minułym hodzie byŭ zmušany wiaści swaju pracu ŭ šmat ciažejšych abstawinach, čymsia ŭ hadoch papiarednich, i dziela hetaha, kali tolki brać pad uwahu lik jaho publičnych imprezaŭ,to zdajecca, što ŭ swajej pracy mała pasunuŭsia napierad.

Pieraškody hetyja ŭ biełaruskaj praświetnaj pracy, jak i ŭsiudy,—jość nutranaha i wonkawaha charaktaru. Da pieršych, nia ličačy „ahulna biełaruskich“, zaličyć treba adsutnaść amal u praciahu ŭsiaho hodu najbolš dziejnych siabroŭ našaha Hurtka, wyjaždžajučych z wioski z pryčyny matarjalnych patreb, aproč hetaha—dalokaja adlehłaść pasialeńnia niekatarych siabroŭ Uradu ad sialiby Hurtka (da 15 kl.) i h. d.

Pamiž pryčynami wonkawaha charaktaru hałoŭnaja była toja, što pawialičyłasia zacikaŭleńnie Hurtkom z boku administracyjnych uładaŭ. Adwiedwańnie amal usich siabroŭ Hurtka kamandantam pastarunku z „pierakonywajučymi“ „dabrazyčliwymi“ hutarkami ab bieskarysnaści biełaruskaj pracy — nia spyniałasia. Čutny byli i takija słoŭnyja pastrachi, jak: sekwestratar wiedaje, da kaho ŭ pieršuju čarhu jechać — da hurtkoŭcaŭ. Heta ŭsio ŭdarała pa najsłabiejšaj strunie našaha wiaskoŭca. U dabawak minułaj wiasny adbylisia ŭ našaj wakolicy aryšty; u liku niekalki aryštawanych pad zakidam „wywrotowej“ dziejnaści byŭ adzin siabra hurtka. Pačalisia rewizyi i dopyty druhich „padazronych“ asob — świedamych biełarusaŭ, zabirańnie biełaruskich knižak i časapisaŭ. Wyniki ŭsiaho hetaha jasnyja..

U źwiazku z wyšejskazanym, kankretnaja praca Hurtka za minuły hod hetkaja: sarhanizawańnie dwuch referataŭ u w. Jakužach, na temy: „Što takoje suchoty i jak z imi zmahacca“ i „Ahlad statutu T-wa B.I.H.iK.“ Prelehentam hetych publičnych referataŭ mieŭ być abs. med. Jazep Malecki. Referaty nie adbylisia — administracyjnyja ŭłady nie dali dazwołu. Hurtok arhanizawaŭ teatralnaje pradstaŭleńnie ŭ hetych-ža Jakužach („Paŭlinka“ J. Kupały), šmat było pałožana trudoŭ i koštaŭ,—adnak i hetaja impreza nie adbyłasia—palicyja nie pazwoliła. Hurtok pawodle mahčymaści pašyraŭ bieł. drukawanaje słowa i bieł. pieśni i h. d. Adbyŭ aficyjalna tolki dwa pasiedžańni Uradu Hurtka, dnia 4.XI.34 i dnia 10.XII-34. Prywatnych pasiedžańniaŭ Uradu było niekalki. Uchodziačych papieraŭ było 4, wychodziačych — 8. Stan kasy Hurtka nastupny: prychod 15,21 zł., raschod 14,50 saldo 00,71 zł.

Dnia 19.I.1935 h. adbyŭsia ahulny hadawy schod siabroŭ, na jakim wybrany nowy Urad u nastupnym składzie: staršynia — Aniśka Aŭhień z Šalcin, sekratar — Aniśka Alena, skarbnik — Turonak Ihnat z m. Idoŭta, Drujskaj woł., zastupniki — Ćwiačkoŭskaja Felicyja i Ćwiačkoŭski Piatro. Hurtok i nadalej mieścicca ŭ domie hr. Cypryjana Karalonka.

Plan pracy na budučyniu taki samy, jak i minułych hadoch, a imienna— u 2-ch hałoŭnych napramkach: 1) praca ŭnutrana — arhanizacyjnaja i tawaryskaha žyćcia (samaaświetnaja praca siabroŭ, jak charaktaru ahulnaha, hetak i fachowa-haspadarčaha, čaściejšyja siabroŭskija tawaryskija zborki i h. d.), 2). praca aświetnaja i hramadzkaja na wonki (publičnyja refe

raty, spektakli — wiečaryny, pašyrańnie biełaruskaha drukawanaha słowa, bieł. pieśniaŭ, biblijateka i inš.).

U wolnych prapazykach pastanoŭlena, miž inšym, ažywić haspadarča-ziemlarobskuju sekcyju Hurtka, jakaja sarhanizawana była ŭ min. hodzie, ale z pryčyny wyjezdu jaje kiraŭnika St Ćwiačkoŭskaha była biaździejnaj. Pastanoŭlena wydawać ścienhazetu siabroŭ Hurtka, pawialičyć biblijateku, jakoj kiraŭnictwa i nadalej daručajecca Alenie Aniśka.

Ad redakcyi. Źmiaščajučy hetuju sprawazdaču z dziejnaści hurtka B.I.H iK. u Šalcinach, my prymušany z swajho boku źwiarnuć uwahu na nienarmalnyja warunki *biełaruskaj* kulturnaj pracy na *biełaruskaj* wioscy. U prošłym numary „B. Krynicy" my pisali ab wyklikańni na pastarunak i ab padrabiaznych „dopytach" siabroŭ uradu hurtka B.I.H iK. u w. Juškoch, Wil.-Trockaha paw. Ciapier majem fakty „adwiedzinaŭ" siabroŭ hurtka kamandantam Drujskaha pastarunku palicyi z „pierakonywajučymi" arhumentami bieskarysnaści biełaruskaj kulturnaj pracy. I heta robicca tady, kali my čujem ad ministerskich i wajawodzkich uładaŭ bieskaniečnyja ćwierdžańni i zajawy, što biełaruskaj kulturnaj pracy ŭ Polščy nichto zabaraniać i tarmazić nia budzie. Dyk na soŭwajecca pytańnie: chto kiruje palitykaj na biełaruskich ziemlach—pan ministar (ewentualna wajawoda), ci pan kamandant pastarunku?

Z wydawieckaha ruchu.

„Slovanska Revue" — heta nowy miesiačnik, jakoha 5-ty numar (m-c studzień 1935) majem prad saboj. Časapis hety pačaŭ wychodzić u Prazie pad kaniec minułaha 1934 h., drukujecca pačesku, a ŭ skład redakcyjnaj rady, pobač z pradstaŭnikami inšych sławianskich narodaŭ, uwachodzić i adzin biełarus — Dr. Tamaš Hryb. Farmat časapisu (21×29 cm.), abyjmo (52 bačyny samaha źmiestu) a hałoŭnaje — sam źmiest jahony dobra świedčyć ab wydaŭcoch i redaktaroch. Za hałoŭnuju metu stawić sabie časapis uzajemnaje paznańnie sławianstwa, choć i nia ŭ formie ŭstarełaha pansławizmu, katoraha wyrazna wyrakajecca. Nia majem usich dahetul wyjšaŭšych numaroŭ hetaha časapisu i tamu nia možam kazać ab całaści. Z taho adnak, što bačym u numary 5-tym, možna sapraŭdy rabić dobryja wysnaŭki. Toje samaje paćwiardžajuć i pieradrukoŭwanyja ŭ hetym numary wodkliki miascowaj českaj presy, a tak-ža i paasobnych asob, što zajmajuć wydatnyja stanowiščy. Adno tolki takoje piśmo, źmieščanaje na samym kancy, wykazwaje žal, što nowaje wydawiectwa nia złučyłasia z isnujučym užo 26 hadoŭ wiedamym wydawiectwam „Slovanskaha Prehledu." — Pierahladany nami numar časapisu nia šmat adnak daŭ miesca biełaruskamu pytańniu, bo znajšli my tut tolki tłumačeńnie na českuju mowu wierša J. Kupały „Maładaja Biełaruś" (na niacełych 50 radkoŭ) i zaciemku ab pamioršym niadaŭna biełaruskim wučonym praf. Br. E.-Šypile. Časapis uwodzić wielmi ščaśliwa padumany muzykalny dadatak, jaki ŭ pierahladanym nami numary taksama česki. Miejma nadzieju, što pabačym tam niekali i dadatak biełaruski. Što jak što, ale pieśnia biełaruskaja nie patrabuje saromicca nawiet i prad pieśniaj českaj, naturalna, kali budzie padadziena ŭ naležnaj formie.

Z pawiedamleńniaŭ redakcyjnych, cikawych dla piśmieńnickich kruhoŭ usich sławianskich narodaŭ, warta ŭwahi nastupnaje: wydawiectwa „Slovanskaj Revue" (Revue=pierahlad) abwiaščaje premiju na najlepšy histaryčny raman piśmieńnikaŭ usich sławianskich narodaŭ. I-ja premija 15.000 českich karon hatoŭkaj (1 českaja karona=21 hrašoŭ) i padarožny kialich, a II ja premija—5.000 kč. hatoŭkaj. Pryniaty raman budzie wydrukawany u mowie tej, u jakoj napišycca, i ŭ českim pierakładzie. — Padpisnaja płata na časapis u hod 90 kč., luksusowaje wydańnie — 210 kč. Cana adnaho numaru zwyčajnaha—10 kč., a luksusowaha — 25 kč. Adras redakcyi: Praha II, Prikopy 14.

K.

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу Выпісвайце найстарэйшую беларускую газэту „Беларускую Крыніцу!"

BIEŁARUSKAJA CHRONIKA.

Praca nad čyścinioj biełaruskaj mowy. U Wilni niadaŭna naładžana praca nad čyścinioj biełaruskaj mowy. Prawodzicca jana biełaruskimi mowawiedami, wučycielami, publicystymi, redaktarami, literatami i piśmieńnikami. Čarhowaja zborka hetych pracaŭnikoŭ adbudziecca 25 h. m. a hadzinie 6 wiečaram u zali Bieł.Inst. Hasp i Kultury—Zawalnaja 1.

Referat mgra St. Stankiewiča. 10 h. m. u T—wie Biełarusawiedy mgr St. Stankiewič pračytaŭ referat, na temu „Biełaruski folklorystyčny element u baladach Adama Mickiewiča." Praciah hetaha referatu adbudziecca u niadzielu, 17-ha h. m., u zali VI-j hałoŭnaha budynku uniwersytetu. Pačatak a hadz. 17-j. Uwachod wolny dla ŭsich.

„Chryścijanskaj Dumki" Nr. 2 na m-c luty wyjšaŭ užo z druku.

Z BIEŁARUSKAHA ŽYĆCIA Ŭ LITWIE

Źjezd Biełaruskaha Kulturna-Praświetnaha T-wa i Nacyjanalnaj Suwiazi Biełarusaŭ u Litwie. Dawiedwajemsia, što 24 h. m. majuć adbycca hadawyja źjezdy hetych biełaruskich arhanizacyjaŭ.

Z dziejnaści biełaruskaha narodnaha teatru. 3 listapada min. h. zładžana pradstaŭleńnie ŭ Koŭnie: adyhrana „Paŭlinka" J. Kupały; 24 taho-ž m-ca, taksama ŭ Koŭnie, zładžana pradstaŭleńnie: adyhrana pjesa „Kaliś" Fr. Alachnowiča.

Biełaruska-Ukrainskaje pradstaŭleńnie. 29 śniežnia min. h. u Koŭnie Bieł. Kult.-Praśw. T-wam i Litoŭska-Ukrainskim T-wam pryjacielaŭ sceny i pieśni było naładžana biełaruskaje i ŭkrainskaje pradstaŭleńnie. Adyhrany - biełaruskaja „Paŭlinka" J. Kupały,—ŭkrainskaja „Buwalščyna" Wesełowśkaho.

Nowy Hod. U Koŭnie, u „Biełaruskaj Chatcy" adbyłosia spatkańnie Nowahą Hodu. Spatkańnie było naładžana Bieł. Kult.-Praśw. T-wam supolna z Litoŭska-Ukrainskim T-wam.

BIEŁARUSY U ČECHASŁAWAČČYNIE.

Uzrost zacikaŭlenaści biełaruskimi sprawami. Da niadaŭna jašče možna było śmieła skazać, što čechi nie hrašyli zacikaŭlenaściu da biełaruskaj sprawy. Było tak 10 i nawiet 5 hadoŭ jašče tamu nazad. Nia toje ŭžo adnak siahońnia. Apošnija padz iei na mižnarodnym hruncie azwalisia recham i tut. Nia budziem hałałsoŭnymi i zaznačym tut niekalki faktaŭ z apošnich miesiacaŭ i tydniaŭ. I tak: u listapadzie m-cy m. h. u zali „Českabrackaj Jednoty" ŭ Prazie, na zaprosiny tawarystwa chryścijanskaj moładzi, Dr. T. Hryb, biełarus, čytaŭ lekcyju na temu: „Jan Hus i Franciš Skaryna."—1-ha lutaha sioleta Čechasławackaje t-wa dziela daśledawańnia nacyjanalnych pytańniaŭ, staršynioj katoraha jość upoŭnawažany ministr zahraničnych spraŭ Čechasławaččyny praf. Dr. K. Krofta, ładziła publičnuju lekcyju taho-ž D-ra T. Hryba na temu „Biełaruskaje pytańnie." Prysutny byŭ pry hetym sam ministr Dr. Krofta, cely rad wučonych, hramadzkich dziejačoŭ i žurnalistaŭ. Na žadańnie prysutnych u chutkim časie maje adbycca praciah hetaje lekcyi — „Biełaruskaje pytańnie ŭ sučasnaści,"—bo lektar u pieršaj swajej lekcyi wyjaśniŭ tolki, skul i jak paŭstała biełaruskaje pytańnie naahuł. — Na inšym miescy padajom siahońnia wiestku ab wychadzie nowaha českaha časapisu „Slovanska Revue," jaki taksama nia minaje biełarusaŭ, a što moža najważniejšaje — adważyŭsia samadziejna acanić dahetulašniaje paniaćcie „sławianstva," jakoje ŭ paniaćci bolšaści čechaŭ aznačała toje samaje, što i rusafilswa. A heta—wialiki krok napierad.

Litoŭskaje T-wa Ćwiarozaści.

U Wilni isnuje Litoŭskaje T-wa Ćwiarozaści. Isnuje jano z 1912 hodu. T-wa heta na niwie narodnaj ćwiarozaści pracuje nia tolki ŭ Wilni, ale tak-ža i ŭwa ŭsim našym krai, dzie žywuć litoŭcy.

Asabliwa dziejna T-wa pracawała apošnija try hady, enerhična pašyrajučy ideju ćwiarozaści siarod litoŭskaha nasielnictwa. Z hetaj metaj kožnaha hodu ŭ miesiacy lutym T-wa arhanizawała Tydzień Ćwiarozaści, praz presu zaklikajučy ludziej nia pić harełki,

---

Wincuk Adważny. 29)

Chłapiec.

POWIEŚĆ.

VI. Dwa chory. (*Praciah*).

Tak prahutaryli da poznaha wiečara. Treba było wypraŭlać chłapcoŭ, ale jany nie chacieli iści damoŭ: prosta zasypali ksiandza pytańniami.

— A ci moža zahinuć prawasłaŭnaja carkwa? — spytaŭsia Piastrejka.

Heta pytańnie wielmi ŭsich zacikawiła.

Ksiondz Hałuza zadumaŭsia.

— Heta mahčyma, ale niepraŭdapadobna, — kazaŭ jon.

— Čamu?

— Bo carkwa zachawała ŭ sabie čystuju, choć niapoŭnuju, wieru; zachawała takža ŭsie sakramanty (tainstwa) i nabaženstwa da Matki Boskaj i da Usich Światych. Dyk wot praŭdapadobna, što carkwa kaliści wierniecca da swajho pnia — da katalickaha kaścioła i tady raścwicie iznoŭ i dašć wialiki płod. Heta budzie kapitalnaja pieramoha nad piekłam i ŭsiej niačystaj siłaj. Ab heta treba časta i horača malicca.

Nareščie chłapcy razyjšlisia damoŭ.

Kali astalisia ŭ dwuch — ksiondz z Charašuchaj, hety zapytaŭsia:

— Jak heta, ksiondz, haworyš: naš narod moža kaliści paŭstać i być niezaležnym? Našy ludzi takija niakulturnyja, prostyja, niaświedamyja, što heta niemahčyma!

— Što ŭ ludziej niemahčyma — to mahčyma ŭ Boha! — kazaŭ pawažna ks. Haluza. — Našaja sprawa — sprawa Božaja: my staim za sprawiadliwaść, i žadajem, kab kožny caławiek i kožny narod mieŭ toje i ŭładaŭ tym, što jamu naležyć ad Boha. Naš narod, jak toje dzicia ŭ kałysce, budučy niaświedamym, dajecca pakryŭdzić: druhija dzielacca i swaracca za našaje dabro. Ale woś my raściom, pačynajem razumieć i hawaryć. Dyk woś naš światy abawiazak paznawać siabie i swoj kraj i narod i pastajać za siabie: usiudy—i ŭ knižkach, i ŭ hazetach, i ŭ škole, u kaściele, u carkwie, u chacie i na rynku — adnym słowam — usiudy! Tahdy i nas ludzi paznajuć, stanuć nas šanawać i daduć nam sprawiadliwaść. A inakš — ničoha nia budzie, budziem wiečna stahnać, narakać, zawidawać i čakać „niabieskich mihdałaŭ" ad druhich susiedziaŭ — blizkich, ci zahraničnych.

— Ciapier druhaja sprawa, — hawaryŭ dalš wikary: — naša adradžeńnie apirajecca na prawie pryrodnym.

— Što heta? — pytaŭsia Charašucha.

— Heta jość prawa, zakon natury —pryrody, założany ŭ samuju hłybiniu našaj dušy i serca. Kožny maje prawa da taho, što zhruntu naležyć da jahonaj natury. Skažam u paraŭnańni: nia budzieš pan karmić kania miasam, a sabaku sienam, bo heta spraciŭlajecca ichnaj natury. Taksama nia budzie ryba chadzić pa ziamli, a kot pławać u wadzie. Wot bačyš, pan, swaju hetuju palmu ŭ wazonie: jana ŭ swajej baćkaŭšynie — u Azii, Afryce — wyrasła-b na cełyja sažni ŭ haru, była-b wialikim drewam: ćwiła-b, dawała-b płady, a tut ledź dychaje, zachireŭšy; bo tut jana žywie ŭ niawoli! Tak i naš biełaruski narod: jon wielmi pracawity i zdolny, a woś nia moža wydać ničoha wialikaha, bo my žywiom čužym ducham — kulturaj čužackaj, katoraja marnuje našy siły. O, kab dać našamu prostamu narodu jahonaje rodnaje słowa ŭ škole, u kaściele, u carkwie, — dyk narod staŭ-by rašci i raźwiwacca, jak ryba ŭ wadzie! a tak...Tahdy naša sława prahulałasia-b pa biełym świecie...

— Hej, hej! heta nia blizkaja sprawa, — uzdychnuŭ Charašucha: — moža za jakich sto hadoŭ niešta takoje i budzie, a tymčasam wialikaja Rasieja nas źjeść i abližacca.

— Na nas ablizywajucca nawiet i dalokija niemcy. Ale žywoha źjeści trudna, a pośle strawić jašče trudniej; bo žywy stanie kryčać i brykacca, a pośle praz bok tabie wylezie. Užo-ž jakija silnyja anhličanie, a irlandcaŭ źjeści nia mohuć; taksama — niemcy čechaŭ, a turki—baŭharaŭ.

— U nas niama saŭsim intelihiencyi, wot chacia-by ksiandzoŭ: ja was tolki pieršaha widžu; a z papoŭ dyk aniwodnaha biełarusa nie spatkaŭ. Dyk hdzie ž toje naša adradžeńnie?

— Pieršaja barazna samaja najtrudniejšaja. Z ksiandzami sprawa lahčejšaja: ksiandzy bolš zdatny da niezaležnaj dumki, bo katalicki kaścioł daje hłybiejšuju kulturu. Dy i z ksiandzoŭ da świedamaści dachodziać tolki ludzi wyšejšaha palotu, katoryja apryč štodziennaj šklanki harbaty, kuska miasa, apryč hazety, kartaŭ i druhoj drabiazy, — jašče ŭmiejuć dumać i lubić. A ŭ inšaha nawiet i pryhožaja duša tak abraście pyłam štodziennaści, ci aplaciecca haspadarkaj, ci palitykaj, dyk ty jamu łob raščapi — jon ničoha nia pojmie. Jašče horš bywaje z ludźmi pustymi, bałtunami, hultajami: takich lepš nie čapać — škoda času. Praciŭnikaŭ haračych, ale razumnych, ja nie bajusia: takija, jak prakanajucca, buduć haračymi biełarusami, a jak nie prakanajucca, dyk astanucca prynamsi tałkowymi praciŭnikami. Najbolšaja adnak nadzieja woś na hetych našych miłych chłopčykaŭ: z ich paŭstanuć kaliści praŭdziwyja adradžency i patryjoty.

— A što heta kažuć, — spytaŭsia Charašucha, — što biełarusy ciahnuć u Rasieju i chočuć pierajści ŭ prawasłaŭje?

— Che! heta čystaja brachnia i machlarstwa: praŭda pakažacca kaliści sama saboj.

Wikary pajšoŭ damoŭ. Było ŭžo pad poŭnač. Na niebie hareli zorki. Paciskaŭ asieńni marozik. Murawanka spała. Ale Charašucha doŭha nia moh zasnuć. Dumki płyli i napływali. —„Ech,—kazaŭ sam sabie Charašucha,—kab choć z dziesiać takich enerhičnych ksiandzoŭ, jak naš Hałuza, dyk sapraŭdy adradzili-by kraj. A tak... I dziŭna, čamu papoŭ biełarusaŭ niama?..." —

Pośle arhanisty ŭbačyŭ, što wikary wiarnuŭsia da jaho, ale niejki asabliwy:—na haławie ŭ jaho była mitra, adzieža, jak u biskupa, a ŭ rukach dźwie majsiejewy tablicy. Charašucha staŭ čytać, što na tablicach napisana, i... nia moh pračytać. Tahdy wikary pracior tablicy: litary zrabilisia wahnistyja — adnak aślapili Charašuchu i jon iznoŭ nia moh pračytać. Tahdy ŭžo sam wikary staŭ čytać hramawym hołasam, jak-by truba jerychonskaja:

„Słuchaj, Charašucha, i ŭwieś Narod Biełaruski!" —

1. Biełarus, paznaj sam siabie!
2. Biełarus, nia stydajsia swajho imieni!
3. Biełarus, pomni, što dzień twajej woli saŭsim blizki!
4. Lubi Baćkaŭščynu swaju, ziamlu swaju i mowu swaju!
5. Nie adrakajsia ani abśmiejwaj bratoŭ swaich
6. Nie haniajsia za ničym čužym!
7. Nia prykidywajsia sam čužyncam!
8. Nie abmaŭlaj swaich bratoŭ, katoryja pracujuć dla adradžeńnia!
9. Nie zawiduj čužyncam ichnaj baćkaŭščyny.
10. Ani ichnaj mowy, ni kultury, i ani ježy, ani adzieży, ani ŭsiaho taho, što bačyš u ich.

Arhanisty prabudziŭsia, zapaliŭ lampu i zapisaŭ na świežuju pamiać hety nowy zakon adradžeńnia.

Plenarnaje pasiedžańnie Sojmu i ekspoze min. Kościałkoŭskaha.

Budžetnaja sojmawaja kamisija užo zakončyła swaju pracu nad dziaržaŭnym budžetam na 1935—36 hod. Budžet hety wyhladaje hetak: — dachody — 2.003.106.700 zł., a raschody—2.170.491.160 zł. Niedaboru bolš jak 167 miljonaŭ zł.

Ciapier hety deficytawy budžet razhladajecca na plenumie Sojmu — adbywajecca dyskusija nad budžetam usich ministerstwaŭ.

Hetkija dyskusii ŭ parlamancie, zwyčajna, majuć charaktar i palityčny, bo wyjaŭlajuć nastroi hramadzkaj apinii pasły—apyzycyjnyja da ŭradu i padtrymliwajučyja ŭrad.

U polskim Sojmie ŭsieŭładna rašaje B.B., bo maje tam bolšaść. Heta partyja padtrymliwaje ŭrad i z uradam supracoŭničaje.

U ciaperašniaj sojmawaj dyskusii, apazycyjnyja pasły wostra krytykawali palityku ŭradu—zahraničnuju i ŭnutranuju. Krytykawaŭ jaje i pas. Jaremič, pakazwajučy na pastupki dziaržaŭnaj administracyi ŭ našym Kraju, jakija, pawodle słoŭ pasła Jaremiča, dziejucca, byccam, pamima woli min. Kaściałkoŭskaha.

Ciaperašni ŭrad da nastrojaŭ parlamanckaj apazycyi nie prysłuchoŭwajecca, a dziela hetaha i apazycyjnaja apinija na maje ŭpływu na palityku.

Padčas hetaj dyskusii ministr unutranych spraŭ Kościałkoŭski skazaŭ pramowu ab unutranaj polskaj palitycy, u jakoj padčyrknuŭ, što **haŭoŭnaja linija polskaj unutranaj palityki astajecca biaz źmienaŭ i nadalej**.

Dasiulešni kurs polskaj unutranaj palityki da nas, biełarusaŭ, i ahułam da terytoryjalnych narodnych mienšaściaŭ — ukraincaŭ, biełarusaŭ i litoŭcaŭ — dobra wiedamy. A z hetaha ekspoze min. Kościałkoŭskaha dawiedwajemsia, što hety kurs biaz źmienaŭ astajecca i nadalej.

Za terytoryjalnuju aŭtanomiju.

Ukrainski pasoł dr. D. Lewicki skazaŭ u polskim Sojmie pramowu hetkaha źmiestu:—U budžetnaj kamisii na plenum Sojmu Ukrainski Klub pradstawiŭ nadzwyčajna ciažkoje pałažeńnie ukrainskaha narodu. Ciapier padčyrkiwaju, što ukrainski narod nia choča być pradmietam, katoraha koštam maje budawacca wialikadziaržaŭnaść Polščy. Jon užo nacyjanalna dawoli świedamy i ahulna imkniecca da ździejśnieńnia swajej historyčnaj misii na ŭschodzie Eŭropy. Na hetym pytańni pawinna zaležyć i Polšču, bo palaki historyčna źwiazany z ukrainskaj nacyjaj. Ukraincy damahajucca ŭsich prawoŭ, jakija naležacca świedamamu narodu, i dumajuć, što formaj ździejśnieńnia hetych prawoŭ jość terytoryjalnaja aŭtanomija. U hetaj sprawie ukraincy padali zajawu i ŭ senacie, damahajučysia pryznańnia aŭtanomii z ułasnym dziaržaŭnym aparatam. —

Nie ad reču budzie pry hetym jašče raz adznačyć, što los Ukrainskaha narodu, na praciahu celych wiakoŭ i ciapier, zusim padobny da losu Biełaruskaha narodu. Ciaperašniaje pałažeńnie biełarusaŭ pad Polščaj takoje samaje, jak ukraincaŭ.

Biełaruski narod tak-ža nacyjanalna dawoli świedamy i ahulna imknieca da ździejśnieńnia swajej historyčnaj misii na ŭschodzie Eŭropy. Biełarusy, taksama jak i Ukraincy, damahalisia i damahajucca ŭsich prawoŭ, jakija naležacca świedamamu narodu.

nia kuryć i arhanizawacca ŭ hurtki ćwiarozaści. Šmat dzie ludzi hetaha zakliku pasłuchali sapraŭdy. Jany rabili schodki, čytali adpawiednuju litaraturu ab škodnaści alkaholu i ab karyści i značeńni wialikaj sprawy ćwiarozaści i časta šmat dzie pastanaŭlali zusim nia pić harełki. Šmat litoŭskamu nasielnictwu ŭ sprawie zrazumieńnia ćwiarozaści pamahło apawiadańnie „Kaniec Leptasa", jakoje napisaŭ Br. Girinis, a jakoje siańnia možna spatkać badaj u kožnaj świedamaj litoŭskaj siamji. Apawiadańnie heta ludzi čytajuć i wučacca žyć.

T-wa Ćwiarozaści pracuje tak-ža i siarod litoŭskaj wučnioŭskaj moładzi. Tak napr. letaś u himnazii i ŭ internacie na temu ćwiarozaści adbywalisia lekcyi.

Niamała pracujuć dla sprawy ćwiarozaści siarod litoŭskaha nasielnictwa litoŭskija wučycieli, kiraŭniki čytalniaŭ, a tak-ža instruktary T-wa św. Kazimiera, jakija adwiedwajučy addzieły i čytajučy tam lekcyi, parušajuć miž inšym i sprawy ćwiarozaści.

Sioleta, aprača pracy zwyčajnaj T-wa, była razasłana sialanam lekcyja ab ćwiarozaści staršyni T-wa, Ks. K. Čybirasa.

2.II. u zali himnazii ŭ Wilni, dziakujučy zachadam uradu T-wa, byŭ arhanizawany wiečar z lekcyjaj i pradstaŭleńniem.

3.II. u zali św. Mikaja adbyŭsia hadawy schod siabroŭ T-wa. Schodu hetaha staršynioj byŭ Staršynia Lit. Tymč. Nac. K-tu hr. K. Stašys.

U swajej sprawazdačy z dziejnaści T-wa, staršynia Ks. K. Čybiras miž inšym skazaŭ, što choć praca dzieła ćwiarozaści ŭ narodzie nia łohkaja, ale ŭsiož jana tam adbywajecca i pakidaje dobryja śłady.

Uprawa T-wa astałasia staraja. Schod zakončyŭsia pryniaćciem niekalkich ważnych dla sprawy ćwiarozaści prapazycyjaŭ.

Hetkija bolš-mienš wiestki ab Litoŭskim T-wie Ćwiarozaści padaje „Viln. Ryt." u Nr. 12 z dnia 9.II. Paznajomicca z sprawaj pracy dzieła ćwiarozaści ŭ litoŭcaŭ, ličym karysnym i dla nas biełarusaŭ. Čas wialiki i nam biełarusam padumać ab planowaj, arhanizawanaj pracy na niwie ćwiarozaści biełaruskaha narodu. *P. Ł—č.*

Padhatoŭka da wajny Italii z Abisinijaj.

Užo pačalisia začepki Italii da Abisinii, kab zhodna z dahaworam, zakliučanym niadaŭna ŭ Rymie italjanskim dyktataram z francuskimi dyplomatami, asiahnuć wałodańnie na pabiarežžy ŭschodniaj častki Afryki.

Italjanski ŭrad zažadaŭ, kab abisynski ŭrad abaznačyŭ hranicy, na abisynskaj ziamli, na terytoryi byccam spornaj z Italijaj, a tak-ža zabiaśpiačeńnia dla Italii swabodnaha tam wałodańnia.

Reč zrazumiełaja, abisyncy tak łohka swajej ziamli i swajho tam prawa nie zrakucca. Jany adrazu pastawili dzieła abarony swajej krainy 40 tysiačnuju armiju i hatowy da boju z Italijaj. Italjanski ŭrad abwieściŭ u słabie mobilizacyju.

Spor miž Italijaj i Abisynijaj ciahniecca ad 1881 h., kali italijancy ŭ Afrycy zachapili ŭschodniuju pabiarežnuju jaje častku. Pašla hetaha, udałosia italijancam zaŭładeć tam pabiarežnaj krainaj, Abisynju ŭziać pad swoj pratektarat. Adnak nia doŭha panawała, tady, tam Italija,—Abisynija ad niaprošanaj apieki wyzwaliłasia. Pašla suświetnaj wajny Musolini adnawiŭ hetu italijanskuju palityku ŭ Afrycy i ciapier, dahawaryŭšysia z Francyjaj, pačynaje užo wykonywać swaje palityčnyja plany ŭ Afrycy.

Francuskija, niamieckija i japonskija hazety pišuć, što italija ciapier tolki stresyć Abisyniju, kab prymusić da pierahaworaŭ i ŭstupkaŭ. Italija, ciapier, wajnoj pakarać Abisyniju nia moža, bo da hetaha jašče nie padhatawana palityka ŭ Eŭropie.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY

Abiadnieła ziemlarobstwa. U Sojmawaj dyskusii nad budžetam min. ziemlarobstwa min. Poniatoŭski skazaŭ, što abiadniełaje ziemlarobstwa zrabiła swoj adpłačak wa ŭsim žyćci celaj dziaržawy. Dzieła hetaha treba źmianić palityku spažywiectwa.

Kamasacyja prawiedziena słaba. Z praznačanych na skomasawańnie 7 z pałowinaj miljonaŭ hektaraŭ ziamli, skomasawana tolki 3 mil. 300 tys. hekt.

Japonski demping. Demping — heta prodaž zahraničnaj tawaraŭ nižej ŭłasnych koštaŭ produkcyi. Polskija hazety padajuć: u 1934 h. japonski demping u Polščy ŭzros da 1.104.400 zł. Najbolš prywoziać japoncy ŭ Polšč wałaknianych tawaraŭ.

55.895 wiaźniaŭ. Ministr sprawiadliwaści Michałoŭski, u senackaj budžetnaj kamisii, zajawiŭ, što ciapier u Polščy siadzić u turmach 55.895 wiaźniaŭ. Turmaŭ u Polščy jość na 40 tysiač. Takim čynam, užo turmaŭ mała.

Bolš paŭmiljona biezrabotnych. Pawodle statystyčnych dadzienych jość ciapier u Polščy (na 2 h. m.) 501.300 asob biezrabotnych. Za adzin minuły tydzień prybyło 13 tysiač biezrabotnych.

Z ZAHRANICY.

Polska-niamiecka-japonski sajuz. Českaja hazeta „Praher Press" padaje cikawuju wiestku ab polska-japonskim i niamiecka-japonskim sajuzach, jakija zakliučany, byccam, suproć Sawietaŭ.

Sawieckaja leninhradzkaja „Prawda" ab hetym piša hetak: polska japonskaje zbliżeńnie nakirawana procił SSRR. Heta nia prypadak, što polska-japonskaja pryjaźń pačała zaciskacca pašla zakliučeńnia niamiecka-polskaha sajuzu.

Słowam, balšawiki bajacca, bo majuć strachu z uschodu, z zachadu i ŭnutry.

Anhielskija kamunisty pracuwajuć nastup na Sawiety. U Mančestery (Anhlija) niadaŭna adbyŭsia kanhres anhielskaj kamunistyčnaj partyi, na jakim pastanoŭlena być pryhatawanym da niebiaśpieki napadu na Sawiety.

Hetu niebiaśpieku anhielskija kamunisty bačać u apošnim parazumieńni Francyi z Anhlijaj i Francyi z Italijaj.

Mižnarodnaja ustanowa baraćby z marksizmam. Hetkaja ŭstanowa paŭstała ŭ Ženiewie (Šwajcaryja). Ustanowa hetaja maje zmahacca z kamunizmam i ahułam z marksaŭskim socyjalizmam.

Achwiary hišpanskaj rewalucyi. Hišpanski ŭrad apublikawaŭ lik achwiaraŭ apošniaj hišpanskaj rewalucyi: zabitych — 1378 asob, ranienych — 2921. Jašče lečacca ŭ špitalach achwiary hetaj rewalucyi—u liku 1200 asob.

Wajna katalikoŭ z biazbožnikami ŭ Meksycy. Užo niekalka hadoŭ, z pierarywami, wiadziecca zajadłaja baraćba katalikoŭ z biazbožnikami ŭ Meksycy. Pad hniotam uradawaha teroru, tamašnija kataliki nia ŭstupajuć, ale z hartam i adwahaj zmahajucca z biazbožnikami za Ideju Chrysta.

Z WILNI.

Świata litoŭskaj Niezaležnaści. 16.II a 7 wieč., z nahody 17-aj hadaŭščyny Niezaležnaści Litwy, u zali himnazii (Dombroŭskaha 5) adbudziecca uračystaja akademija z nastupnaj prahramaj: ustupnaje słowa Staršyni Lit. Tymč. Nac. K—tu hr. K Stašysa, referat Ks K. Čybirasa, pradstaŭleńnie i pieśni.

Biezidejnyja najmity. Jość u Wilni hrupka ludziej, što najmajucca pisać i wydawać hazety, jakoha chto choča kirunku. Ciapier hetaja „słaŭnaja" kumpanija wydaje hazecinu „Родны Край." Chto ich nanial — widać pa rabocie!

Apošnim numaram „P. K." najmity starajucca ŭspakoić haspadara, kab nie bajaŭsia Biełarusaŭ, ćwierdziačy, što ideja niezaležnaści Biełarusi naležycca užo tolki niabožčykam.

Za hetkuju słužbu honiać z panadworka won!

Zamuž pajšci, treba znać...

(*Zaciemki na Miasajed*).

Miasajed na Biełarusi heta dobry čas i žanicca i zamuž wychodzić. Usie ludzi heta dobra wiedajuć. A našy dziaŭčaty, dyk praz uwieś Miasajed i siadziać tolki ŭ woknach, łowiačy wucham kožny zwanok: ci nie swaty da ich zdarajucca?...

Chłapcy-ž patrasajuć tolki swaje kiašeni, pahladajučy tudy, ci jašče tam što z hrašej astałosia. A kali hdzie choć naklunieeca jakoje wiasielle, dyk tam tady padymajecca ruch. Na't stareńkija kabiety i tyja lubiać pahawaryć ab wiasielli. Na samym-ža wiasielli ludziej poŭna i ŭsie tady na maładych hladziać. Pry ślubie i to cikawych staić hurma.

Moj susied u hety Miasajed ažaniŭsia. Mianie starejšaha jon niejak prasiŭ, kab dać jamu parady ŭ nowym jahonym žyćci. Woś dzieła heaha ja i pišu.

Na świecie jość usialakija žonački, dy ŭsialakija taksama i mužočki. Bo ž hety świet — pahaworka kaža— jak makaŭ ćwiet i maja nawuka ab žyćci u žanimstwie dla adnych moža trapić pad naturu, a dla druhich i nie.

Ja chaču, kab heta maładaja para, što sioleta pabrałasia, pryhladałasia žyćciu druhoj pary ŭ našaj wiosky, jakaja užo pa ślubie pražyła hadoŭ niekalki. Na hetaj druhoj pary ŭsio dobraje ludzi bačać.

Hanusia akuratnaja kabiecina. Užo čaćwierty hod jana žywieć z mužam. Dačakalisia jany dwoje dziaciej, a za paru niadzielak moža budzie j treciaje.

Jana kabiecina tarapliwaja, łohkaja ŭ sužyćci, nadta sprytnaja da raboty i wielmi čułaha serca. Čuć što nie taki samy i jaje muž.

Usiudy jany i zaŭsiody aboje razam. Na poli ci ŭ domu — razam. U kaściol ci na kirmaš jeduć — razam. U świata, za ruki pabraŭšysia, iduć ahladać žyta — razam. Pa miažy kwietki źbirajuć — i to razam i płatuć jany wianki — razam. Ludziam sa starany zdajecca što heta para adzin biaz druhoha žyć nia mohuć.

A Hanusia nia to, što jaje ŭ čuprynu trymaje. Nie. Muž jaje čujecca nadta swabodnym i kruhom zdawoleny. A kali jon na dzień, abo na dwa adlučycca z domu, to jana choć i čuje sum u swaim sercy, hetaha mužu nia kaža. Maŭčyć cichańka! Bo jana wiedaje, što lišni žal moža razdražnić i muža i jaje samuju.

Ale ja tut pakidaju swaju wiosku i henyja ŭ jej dźwie pary maładych ludziej. Ja chaču ahułam nawuku padać ab žyćci biełarusa ŭ žanimstwie, kab heta maja nawuka mahła praniknuć u najšyrejšyja słai biełaruskaha hramadzianstwa. I hetak ja padčyrkiwaju tut šeść zakonaŭ ščaśliwaha sužyćcia ŭ žanimstwie.

1. Muž i žonka budźcie dobrymi adzin da druhoha. Nia mučcie adzin druhoha lišnimi pytańniami, bo heta zachmuraje waša žyćcio.

A kali wam zdarycca ŭ žyćci pawadzicca, to adzin druhomu nie prypaminajcie tady daŭniejšaha, bo heta wyklikać moža jašče bolšuju buru.

2. U dumkach i čynach trymajciesia wysoka, da lepšych i wyšejšych rečaŭ imkniecieśia ŭsimi swaimi siłami. Žonka nie kažy hetak, što jak ty zławiła sabie muža, to možaš apuščacca i rabić i chadzić možaš aby jak!

3. Žonki nia ŭździeržywajcie swaich mužoŭ ad dobrych i šlachotnych čynaŭ.

4. Nie zhadžajciesia z tym, što wy mała na świecie ważnyja. Miejcie ŭ sabie schawanaje niešta takoje, za što wašy mužy was-by canili bolej.

5. Pomnicie žonki i na heta, što wašy mužy choć i jak-by lubili was, to jany i dla siabie majuć prawa zachawać swaje asobnyja myśli i swoj asobny čas.

6. Žyćcio ŭ žanimstwie pryraŭniać možna da henaj pryhožaj jadwabnaj istužki, jakuju papałam razrezać možna, ale pašla choć i źwiažam jaje, to jana užo nia budzie takoj hładkaj i pieknaj, jakoj była pierwiej.

Na hetym ja konču swaje dumki na miasajed.

W. D—a.

Piśmy z wioski.

Ab našaj wakolicy.

Alkowičy, Wialejskaha paw.,— heta niewialičkaje miastečka. Wyhladam swaim prypaminaje chutčej biednuju wiosku. Čym moža pahardzicca heta je miastečka — heta swaim pryhožym kaściołam. Wysokaja wieža pryhožaha kaścioła, wymurawanaha z čyrwonaj cehły ŭ hotyckim styli, daloka krasujecca, użbiwajučysia pad nieba, byccam prosiačy tam apieki nad hetym biednym, hłuchim i zabitym kucie. Pobač z hetaj krasoj miastečka i jejnych wakolicaŭ, prynižana wyhladajuć ubohija sialanskija chatki z sałamianymi strechami.

Jošč tut dźwie chryścijanskija kramy (aniwodnaj žydoŭskaj; žydki mabyć bajacca pahraničča), jakija, jak i wa ŭsich kutoch našaj Zachodniaj Baćkaŭščyny, bojka tarhujuć atrutaj-denaturam. Miestačkowuju intelihienсyju tworać wučyciali palaki i ksiondz, pachodziačy z Ašmianščyny, ale biełaruskaha słowa ad jaho nie pačuješ. Pierad ciapierašnim ksiandzom byŭ tut ks. Antoni Chomski. Prabyŭ jon tut niadoŭha, ale astawiŭ pa sabie duža dobryja ŭspaminy. Z miascowymi abšarnikami ŭ drużbu nie zachodziŭ, prostych ludziej i ichnaje rodnaje mowy nia čuraŭsia, a sam lubiŭ pahawaryć pabiełarusku i papiajać našuju pieśniu. Paławańniami na źwiarynu, jak robić ciapierašni probaršč, brydziŭsia. Za karotki čas swajho pabytu ŭ Ałkowičach, paznaŭ usich swaich parachwijan, pabywaŭ u kožnaje sialanskaje chacie. Rupny byŭ da swaich pastyrskich abawiazkaŭ. Kaloła ŭsio heta tutejšych abšarnikach i, nia hledziačy na staraňni sialan (kolki razoŭ pasyłali adumysłowyja delehacyi da arcybiskupa ŭ Wilni), jaho adsiul pieramiaścili.

Rajon Alkowič — heta adzin z najbiadniejšych, zabitych i najciamniejšych kutoŭ našaj zachodniaj Maci-Biełarusi. Hranica z Sawietami tut-ža, zarabotkaŭ nijakich, pryhniečanaść i strašennaja halita. Jošć praŭda i tut świedamyja i dziejnyja biełaruskija adzinki, ale i jany, ciarpiačy strašnuju biadu i buduču na „woku", nia mohuć pawiaści adradženskaj pracy na biełaruskaj niwie šyrej. Madziejuć u biadzie, ale nie paddajucca adčaju. Heta cichija hieroi. Češć im i spary Boh ich pracu!

Biełaruskaje drukawanaje słowa nachodzić tut spahadliwaść. Achwotna čytajuć „Krynicu". Nawat i tyja, što naležać da parachwijalnaha „Kółka", naładžanaha ciapierašnim ksiandzom pry dapamozie miascowaj abšarnički, cikawiacca boĺš swaim rodnym, čym čužym—polskim. Jošć i tut „Stralec" i jašče niejkija druhija polskija arhanizacyi, ale tolki na papiery. Nichto z sialan imi nia cikawicca.

Błaha toje, što siudy mała dachodzić biełaruskaha drukawanaha słowa. Biednata nie daje mahčymaści wypiswać swaich knih i hazet, a wiedajučy, što i centr naš biedny taksama, dyk darmowaha prysyłańnia niaważacca prasić. Moža B.I.H iK. štokolečy ŭ hetaj sprawie dapamoh-by?

* *

Da ŭsialakich złybiadaŭ, jakija pieražywaje naš pahraničny kut, treba dałučyć jašče i stoletnija marazy. Jany dakučajuć ludziam. Ale čym abahreć chatu, kali niama droŭ? Na panska abšarnickija lasy, jakich jošč tut nia mała, my možam tolki pahladzieć, ale droŭcaŭ tam dastać nia lohka, a časam i zusim niemahčyma. Praŭda, niekatoryja abšarniki, prykładam M. Bahdanowič, „litujecca" nad nami, dajučy ŭ swaich lasoch na padbor hnillo i suččo. Ale nie padumajcie, što zadarma. Za hetaje hnillo treba adrabić, wytrałoŭwajučy tawar z panskich puščaŭ. A druhi bujny abšarnik K. Baroŭski, wiedamy sa swajej žorstkaści da sialan, nia stydajecca brać za woz chworastu pa 50—80 hr. Achwotnikaŭ na heny „tawar" jošč niamała, bo choład, jak i hoład, čaławieku nia rodnaja ciotka. Abšarnikaŭ kazna prymušaje dbać ab dobrym stanie swaich lasoŭ, a heta abšarniki mohuć zrabić pry pomačy rabotnikaŭ. Ale paŝto ich najmać i im płacić, kali pad bokam jošć harotny siarmiažnik, katory, pryšoŭšy i za dwaccać wiorst, ačyscić panu les, pryplaciŭšy za jahonuju „łasku". P—ny.

Ab našych ksiandzoch.

Łyntupy, Świancianskaha paw. U našych Łyntupach jošć pryhožy kaścioł. U nas usie katoliki. Choć parachwijanie ŭsie biełarusy, ale ŭ kaściele našym nie pačuješ nawat adnaho słoŭca pabiełarusku — polščyna ŭ kaściele. Da biełarusizacyi kazańniaŭ i dadatkowych nabaženstwaŭ u nas ješče daloka. Pryčynaj hetaha — słabaja świedamaść parachwijan. Majem my ciapier u našaj parafii dwuch ksiandzoŭ: adzin rodam ličwin, druhi palak. Ksiondz ličwin nikoli nie wystupaŭ procił biełarusaŭ. Papiarednikam ciapierašniaha ksiandza palaka byŭ u našaj parafii ks. Dalinkiewič—biełarus. Choć ks. Dalinkiewič kazańniaŭ pabiełarusku i nie hawaryŭ, ale biełaruskuju mowu ŭpiataŭ pamiž polščyny. A kali jechaŭ pa kaladzie, ci da chworaha, z ludźmi hawaryŭ tolki pa biełarusku. Dzieciam školnym razam z roznymi inšymi polskimi časapisami dawaŭ časta „Chryścijanskuju Dumku". Za heta musić i nie ŭpadabali takoha prefekta pany i roznyja paŭpanki.

Ciapier, jak uspomniena wyšej, majem na miesca ks. Dalinkiewiča nowaha ksiandza—palaka. Usim nam było cikawa, jakoje abličča wyjawić hety nowy ksiondz. Pa Kaladach pačaŭ hety ksiondz kaladawać, chočučy paznać sialan. Usie dumali, što budzie pytacca katechizmy, ale ksiondz ab hetym nawat i nie ŭspaminaŭ, dapytawaŭsia tolki, chto čytaje „B. Krynicu". U našaj parafii mnoha chto čytaje hetu hazetu, dyk ksiandzu rabоty było mnoha. Kožnamu tłumačyŭ, što „Krynicy" čytać nia možna, bo zabaraniŭ arcyb. Jałbžykoŭski. Kazaŭ, što pasła zabarony ŭsie kataliki adraklisia ad „B. Krynicy". Ab „Šlachu Moładzi" nia mieŭ mnoha čaho hawaryć. Skazaŭ tolki, što „Šlach Moładzi" čytaje toj, chto choča bawiecca ŭ „palityčku". Kožnamu raiŭ čytać „Rycerza" i „Pšewodnik Katolicki", kažučy, što heta časapisy apolityčnyja. Kali jamu niekatoryja napaminali ab „Chr. Dumcy", to ksiondz machaŭ tolki rukoju. Chwaliŭsia mnie adzin chłapiec, što ksiondz jamu kazaŭ, byccam u hetaj sprawie choča jon painfarmawacca ŭ arcyb. Jałbžykoŭskaha i ŭ ks. A. Stankiewiča, z katorym, jak jon kazaŭ, dobra znajomy.

Ale my, mima ŭsiakaj chłuśni henaha ksiandza-palaka, dobra wiedajem, što „B. Krynica" zabaroniena je čytać katalikom biespadstaŭna, dyk my „Krynicu" jak čytali, tak i budziem čytać, bo „Krynica" nie wystupaje procił ksiandzoŭ, ale procił polonizawańnia biełarusaŭ.

Dyk woś jaki ŭ nas ksiondz palak.

Čytač B. K.

Ksiondz strašyć.

Ikaźń, Brasłaŭskaha paw. Na pačatku minułaha miesiaca naš miascowy ks. W. Łaban chadziŭ pa miastečku pa kaladzie. U nas taki zwyčaj, što duchoŭnik spatykajuć u chatach z wialikaj pašanaj.

Papiaredniki ks. Łabana nadta dobra razumieli swaich parafijan i adpawiedna da ich prystasoŭwalisia.

Ks. Łaban daloka astaŭsia ad swaich papiarednikaŭ. Woś fakt: chodziačy pa miastečku, zajšoŭsia ks. Łaban u chatu skarbnika tutejšaha hurtka Biełaruskaha Instytutu Hasp. i Kultury M. Špaka. Pačaŭ jaho strašyć Berezaj Kartuzkaj — za toje, što Špak dziejny biełarus!

Parafijanin.

Утраквістычнае прадстаўленьне.

Залесьсе, каля Маладэчна. На праваслаўныя Каляды — 7.I.1935 г. у нас было польска-беларускае прадстаўленьне. Ставілі: „Nie odparty argument" і „Зьбянтэжаны Саўка". Ігралі вясковыя аматары сцэны. Прадстаўленьне было ў памешканьні „Стральца". Народу — пераважна нашая, ваколічная, беларуская моладзь — было на прадстаўленьні многа. Сьпярша была польская сцэна. Прайшла без зацікаўленьня, бо мала хто і што зразумеў. Затое другая, беларуская, ажывіла прысутных. Не зважаючы, што беларуская сцэна была падгатавана „абы з плеч у печ", аднак яна была цэнтрам увагі прысутных.

Нават і гэтае прадстаўленьне паказала, што беларусам патрэбна культурная праца беларуская.

К.

„...Ну проста хоць крыкні ратуй!.."

м-ка Астрына, Шчучынскага пав. Вельмі кепска жывецца нашым сялянам у цяперашнім часе. Гаспадаркі вельмі малыя, бо многа ўжо ёсьць такіх, катурыя маюць усяго адзін гэктар зямлі. Ведама, з такой гаспадаркі трудна пражыць. Заработкаў таксама няма, а калі прыдзецца дзе зарабіць якіх два, тры залатых, дык трэба працаваць цэлы дзень з канём, але і такіх заработкаў няма. Прадаць з гаспадаркі няма як, бо ўсё вельмі таннае і прадаць няма чаго. Многа сялян дачакаўшы вясны мусяць купляць збожжа, а вельмі часта жыць бяз хлеба. Ходзяць чуткі па нашай воласьці, што скора будуць сэквэстратары „ściągać długi państwowe". За кажную „візыту" такога пана, трэба заплаціць паўтара залатога. Задоўжаных вельмі многа і за некалькі гадоў. Апроч гэтай бяды, сяляне маюць бяду з зладзеямі, катурыя разьвяліся ў нашай воласьці. Выпадкі зладзейскія паўтараюцца вельмі часта — крадуць што толькі пападае ў рукі, — ўкрадаюцца ў хлявы і сьвірны. З усіх бакоў напалівае на нашае сялянства бяда, з каторай трудна селяніну змагацца.

Шчырык.

Ратуйма вёску.

Габы, Пастаўскі пав. Страшнае зьявішча праяўляецца цяпер у беларускай вёсцы — п'янства, зладзействы і агульны ўпадак маральнасьці. Па гэтай маральнай дрыгве не спыняюць свайго бязкарнага паляваньня на беларускую народную душу рознага колеру польскія „культуртрэгеры". Іхнія захады і дзеяньні ня маюць ніякага ўплыву на жыцьцё ў беларускай вёсцы. Яны засноўваюць па нашых сёлах розныя роду арганізацыі, якія маюць у праграме і маральнае ўзгадаваньне моладзі, але гэта ўсё для нашай моладзі чужое, незразумелае; беларуская моладзь інстынктоўна бачыць, што ў гэных арганізацыях можна загубіць народную душу. Сваей, беларускай, арганізацыі няма, адкрыць яе—цяжэй, як на даждж высахнуць. Беларуская вёска тоне ў цемнаце і маральным брудзе. Моладзь крадзець дробныя рэчы ад бацькоў і ад суседзяў, а прадаўшы іх купляе дэнатурат і гэтай атрутай заліваецца.

Браты, беларускія інтэлігенты! Ратуйце вёску ад маральнага разгнаеньня. Давайце на вёску кніжак, газэт, рэфэратаў!

П. Л—ук.

Ад рэдакцыі: Падайце адрасы сьведамейшых адзінак, катурым можна пасылаць газэту. Прышліце грошы на перасылку кніжак, дык вышлем літаратуру дзеля распаўсюджаньня.

Ciomny naš kutok.

Mur.-Ašmianka, Ašmianskaha paw. U nas niama čym pachwalicca — ciemnata nieprahladnaja kruhom. Wa ŭsiej wakolicy niama aniwodnaha sialanskaha chutara; niama i hazety i kniżki. U nas ŭsie sialanie prawodziać wolny čas pry kartach — hrajuć u „ramzy" i „horby". Ciapier kala nas pašyryłasia złodziejstwa — kraduć što papała: koni, karowy, abirajuć świrny, a palicyja šukaje samahonki. Złodziei ŭ našych wakolicach niaŭłoŭleny, kali ich pałowiać, — niawiedama.

Braty, sialanie, wypisywajcie dobryja hazety i čytajcie kniżki ŭ wolny čas, bo inakš, u ciemry zahiniem.

Francіš.

Ab aświecie ŭ nas.

Haradyšča, kala Baranawič. Škoły, jak hałoŭnyja dziejniki aświety, u nas polskija. Raniej jany byli biełaruskimi, abo ŭtrakwistyčnymi. Škoły hetyja wykłučna pačatkawyja (1, 2, 3 klasowyja da 5-ci addziełaŭ; adna tolki, i to nia poŭnaja, 6-ci klasowaja; 7-mi addziałowaja pačatkawaja škoła ŭ Haradyščy raniej była ŭtrakwistyčnaj). Wučać u ich hałoŭna polskaj mowy i polskaha patryjatyzmu.

Usio heta adnak dajeć polščynie małuju karyść. Dzieci ŭ biełaruskim wiaskowym asiarodździ zabywajuć polskuju mowu i pačynajuć razumieć pryhožstwa swajej rodnaj, biełaruskaj.

Dzieci, katoryja ŭ škole adznačajucca „tupahałowaściu" (a sapraŭdy heta niazdolnaść zachapicca nawukaj u polskaj mowie) u chacie pamastacku deklamujuć biełaruskija wieršy. U nas prynіata na wiečarynkach deklamawać biełaruskija wieršy. Robić heta darosłaja moładź.

Pry kožnaj škole isnuje „Świetlica", ale jana na našu moładź upływu nia maje, bo naša moładź świedamaja nacyjanalna.

Pašyrajecca ŭ nas samaadukacyja i to čysta biełaruskaja, choć adčuwajecca krychu brak niekatorych biełaruskich kniżak. Wialikim zapatrebawańniem adznačajucca: Fr. Bahušewiča „Smyk" i „Dudka", W. A. „Cymbały Biel.", J. Kupały „Šlacham žyćcia" i naahuł usia naša litaratura čytajecca z zachapleńniem. Moładź našaj wołaści prenumeruje ŭsiu wychodziačuju biel. presu. Wialikuju rolu ihrajuć biełaruskija biblijateki, kniżki jakich wandrujuć pa wioskach. Ładzicca ŭ nas supolnaje čytańnie.

Prychodziłasia mnie na supolnym čytańni čytać powieść Wincuka Adwažnaha „Chłapiec", jakaja drukujecca ciapier u „Biel. Krynicy". Powieść heta adznačajecca swajej sapraŭdy biełaruskaściaj, typowaściaj dziejučych asob, idealnymi, zachoplіwajučymi i prostymi apisańniami pryrody, prytym prasiaknuta lohkim humaram. Powieść heta wykliкała ŭ słuchačoŭ zachopleńnie i wiasioły nastroj, prytym chłopcy hawaryli, što tolki ŭ našych biełaruskich hazetach jošč što pačytać. „Biel. Krynica" karystajecca wialikim aŭtorytetam dziela swajej sapraŭdy biełaruskaj idei i bahataha i cikawaha źmiestu.

Pawažanyja Karespandenty „Biel. Krynicy i moładź z wiosak! Starajciesia ładzić supolnaje čytańnie biel. drukaŭ, kab praz heta zacikawić swaju moładź čytańniem naahuł i rodnaj litaratury ŭ asobnaści!

Rand.

З жыцьця польскіх земляробскіх арганізацыяў.

У Нясьвіскім пав. ёсьць цэлая сетка польскіх гэтак званых „rolniczych" арганізацыяў: „kółka rolnicze", „koła gospodyń wiejskich" і інш. Усе гэтыя арганізацыі, калі іх можна назваць арганізацыямі, злучаны ў адно цэлае, пад назовам: „Okręgowe Towarzystwo organizacyj i kółek rolniczych w Nieświeżu".

Большая часткa сяброў гэтых арганізацыяў — чыстакроўныя беларусы. Вялізарны ўплыў на кіраўніцтва акружным таварыствам мае сэнатар з Бэ-Бэ О. Еленські — мясцовы земляўласьнік. Маючы пад рукой двух інструктараў-аграномаў, гэты сэнатар праяўляе нейк азнакі жыцьця гэнага таварыства ў цэнтры. „Кольні", якія параскіданы па вёсках, нашто існуюць, няма ведама?! Мусіць дзеля формы. Яны не праяўляюць ніякае дзейнасьці! Звычайна ў гэтыя „колкі" запісана па 3—4 асобы, якія самі ня могуць сьцьміць, нашто іх уписалі. Сяляне ня бачачы ніякае карысьці з гэтых „колкаў", да іх ня ідуць і адносяцца крытычна. Характэрна, што асаднікі і мясцовыя паўпанкі таксама ня ідуць у гэтыя „колкі".

Вось як выглядаюць польскія земляробскія арганізацыі на нашых землях.

Кулиновец.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1—2. Wydawiec A. Šutowič